*С.А. Юрыс, ГДТУ імя П.В.Сухога, г. Гомель*

# РАЗВІЦЦЁ СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫІ ЗАХОДНЯГА РЭГІЁНУ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945 – 1949)

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны спажыўкааперацыя заходняга рэгіёну БССР знешне выглядала як шматгаліновая сістэма, якая развівалася дастаткова дынамічна. Лічылася, што пайшчыкамі спажыўкааперацыі на 1.01.1941 г. з'яўлялася 48,8 % дарослага насельніцтва заходніх абласцей рэспублікі, аб'яднаных у 453 сельпо [1, л. 2]. Сума паявых узносаў у 1941 г. у цэлым па рэспубліцы складала 7 млн. 527 тыс. руб. (сярэдні пай на аднаго пайшчыка быў роўны 35 руб. 40 кап.). Такім чынам, пайшчык не мог пад пагрозай выхаду з кааператыўнага таварыства дабівацца ўплыву на рашэнні кіраўніцтва. Адзяржаўленне кааперацыі, якая ператварылася, па сутнасці, у яшчэ адно ведамства, прывяло да таго, што пайшчык са сваім першапачатковым узносам апынуўся выключаным з працэсу кіравання.

Вайна нанесла вялікі матэрыяльны ўрон, было страчана больш за 40 % матэрыяльнай базы кааператыўных арганізацый. Так, сума ўрону па Гродзенскай вобласці склала 30 млн. 58 тыс. руб. [2, л. 9], Маладзечанскай – 72 млн. 845 тыс. руб. [3,л. 166], Брэсцкай – 40 млн. 360 тыс. руб. [4, л. 171].

Белкаапсаюз спыніў сваю дзейнасць у сувязі з акупацыяй у пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Па меры вызвалення заходніх абласцей рэспублікі, у адпаведнасці з пастановай СНК БССР ад 19 кастрычніка 1943 г., пачалося аднаўленне кааператыўнай гаспадаркі.

Сістэма сельпо з-за недахопа гандлёвых работнікаў, памяшканняў для магазінаў, лавак і складоў аднаўлялася павольна. Першапачаткова ўсё гандлёвае абслугоўванне насельніцтва, забеспячэнне хлебам, развіццё грамадскага харчавання ўскладвалася на райспажыўсаюзы.

Сельпо непасрэдна ствараліся пайшчыкамі. Аднак імкненне да павышэння рэнтабельнасці сельпо за кошт злучэння прывяло да таго, што па рэкамендацыі вышэйстаячых кааператыўных арганізацый праводзіўся курс на няўхільнае скарачэнне іх колькасці. Калі да вайны ў заходніх абласцях было 453 сельпо, то на 1.01.1946 – 343, на 1.01.1947 г. – 376, дасягнуўшы максімума ў 1948 г., з 1949 г. колькасць сельпо пачала скарачацца [1, л. 3]. Ідэя адміністрацыйнага ўзбуйнення кааператываў, якая выдавалася за рацыяналізацыю іх дзейнасці, была падтрымана і ў пастанове Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б ад 3 мая 1949 г., у якой утрымоўваліся рэкамендацыі па аздараўленню фінансавага становішча спажывецкіх таварыстваў. Пры адсутнасці ўмоў для пашырэння гаспадарчай дзеннасці і рэнтабельнасці прапанавалася ўзбуйніць невялікія нерэнтабельныя сельпо [5, л 26].

Умовы для паляпшэння дзейнасці сельпо на месцах існавалі, але для гэтага неабходна было перабудаваць дзейнасць кааператыўных таварыстваў, развіваць дэмакратычныя пачаткі, актывізаваць удзел пайшчыкаў, падняць іх матэрыяльную зацікаўленасць у выніках дзейнасці. Вялізныя рэсурсы знікалі з-за растрат і крадзяжу, затаварвання асобных гандлёвых прадпрыемстваў, слабога кантролю за прадукцыяй прамысловасці. Растраты і крадзяжы ў спажыўкааперацыі БССР за 1946 – І949 гг. склалі 80724 тыс. руб. [6, л. 120], страты ад бесгаспадарчасці толькі па выніках 1948 г., за вынікам дазволеных, склалі 52246 тыс. руб. [7, л. 57].

Праўленнямі аблспажыўсаюзаў былі распрацаваны праграмы развіцця прадпрыемстваў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання, баз і складоў. Адзначым, значная частка збярогшыхся за гады вайны будынкаў прыйшла ў заняпад. Неабходна было правесці вялікую работу, бо да 1945 г. уся гандлёвая сетка кааперацыі заходняга рэгіёну складала 28,6 % ад даваеннага ўзроўню. На 1.01.1945 г. у заходнім рэгіёне было створана 295 сельпо, аб'яднаных у 69 райспажыўсаюзаў, тут налічвалася 123190 пайшчыкаў [8, л. 196]. Рознічная гандлёвая сетка складалася з 1237 магазінаў, палатак і ларкоў [8, л. 195], 73 прадпрыемстваў грамадскага харчавання, 68 хлебапякарань і 96 прадпрыемстваў па выпуску тавараў спажывання [8, л. 206].

З пераходам да аднаўлення народнай гаспадаркі ў спажывецкай кааперацыі пачалася падрыхтоўка да адмены карткавай сістэмы: былі адрамантаваны гандлёвыя памяшканні і хлебапякарні, вялікая ўвага ўдзялялася будаўніцтву новых гандлёвых кропак. У выніку перыяд 1946 – 1947 гг. характарызаваўся самымі высокімі тэмпамі прыросту гандлевай сеткі 137,5 %, якія да пачатку 50-х гг. стабілізаваліся на ўзроўні 102 – 104 %. Разам з тым неабходна адзначыць, што аднаўленне ішло з вялікай цяжкасцю і нават на 1.01.1951 г. яна дасягнула толькі 73,5 % да даваеннага ўзроўню [9, л. 9].

Да вайны вытворчая дзейнасць спажывецкай кааперацыі рэспублікі была абмежавана. Ей дазвалялася займаць толькі хлебапячэннем, вытворчасцю безалкагольных напіткаў і пераапрацоўкай сельгаспрадукцыі. Валавы аб'ем прадукцыі за 1940 г. склаў 33 млн. 429 тыс. руб, у тым ліку: хлебапячэнне – 82,9 %, перапрацоўка сельгаспрадукцыі – 11,3 %. Вытворчасцю прамысловых тавараў шырокага ўжытку спажывецкааперыцыя ў гэты час не займалася.

У краіне мела месца жорсткая сістэма размеркавання рэсурсаў, таму Белкаапсаюз, па сутнасці абмежаваў сваю ролю размеркаваннем тавараў, якія ён атрымліваў ад дзяржавы. Удзельная вага дэцэнтралізаваных закупак у рознічным гандлі складала каля 7 – 8 %.

Каб лепш забяспечыць насельніцтва прадуктамі харчавання і прамысловымі вырабамі, спажыўкааперацыя ў пасляваенны час прыступіла да арганізацыі ўласных прадпрыемстваў па вытворчасці тавараў шырокага ўжытку на базе мясцовых сыравінных рэсурсаў. Пастанова Савета Міністраў СССР ад 9 лістапада 1946 г. паскорыла працэс стварэння такіх

прадпрыемстваў. Так, па плану 1947 г. Гродзенскі аблспажыўсаюз павінен быў адкрыць 30 новых вытворчых прадпрыемстваў і прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання, а адкрыў 64. На 1.01.1947 г. такіх прадпрыемстваў у Гродзенскай вобласці было 136, што дазволіла выканаць план вытворчасці тавараў на 247,3 %, пры плане 2 млн. 785 тыс. руб., тавараў выраблена на 6 млн. 880 тыс. руб. [2, л. 56].

Большасць гэтых прадпрыемстваў былі дробнымі, з прымітыўным абсталяваннем, з колькасцю працуючых ад 3 до 5 чалавек. Якасць прадукцыі была не высокая, але яны выпускалі неабходныя для насельніцтва тавары. У з'яўленні шматлікіх прамысловых кааператыўных прадпрыемстваў праявілася тэндэнцыя развіцця новага гаспадарчага механізму, накіраваная на пэўнае пашырэнне гаспадарчай самастойнасці прадпрыемстваў, укараненне гасразліку. Разам з тым, гасразлік другой паловы 40-х гг. не быў і не мог быць поўным, яго асаблівасць у абмежаванні ўсімі відамі рэсурсаў. У канцы 40-х гг. пачаўся працэс ліквідацыі прамысловых прадпрыемстваў спажыўкааперацыі. Ён быў паскораны і некаторымі нарматыўнымі актамі. У асобнасці, пастановай Савета Міністраў СССР ад 14 красавіка 1948 г. «Аб пранікненні прыватніка ў кааперацыю і прадпрыемствы мясцовай прамысловасці», якая прывяла да масавага закрыцця кааператыўных прадпрыемстваў. Мясцовыя дзяржаўныя органы, карыстаючыся пастановай часта неабгуртавана зачынялі прадпрыемтсвы спажыўкааперацыі. Так, пасля праверкі Пінскага прамкамбіната былі ўстаноўлены недахопы ва ўліку і праваздачы. Вынікі праверкі былі выкарастаны Пінскім гарсаветам для закрыця цырульні, мастацкай майстэрні, фотаатэлье. Падобныя выпадкі мелі месца ў Баранавіцкай і інш. абласцях [10, л. 98].

У пасляваенны час кааператыўным органам давялося вырашаць складаную задачу забеспячэння спажыўкааперацыі кадрамі. Большасць кааператыўных арганізацый адчувалі вострую нястачу працоўнай сілы. У 1945 г. занятых у спажыўкааперацыі заходняга рэгіёну было ў 3 разы менш, чым у 1941 г. Больш за 75 % работнікаў упершыню прыйшлі ў кааперацыю, не маючы вопыту гандлёва-нарыхтоўчай дзейнасці [11, л. 56]. У асноўным заставаліся вакантнымі пасады спецыялістаў: рэвізораў, бухгалтараў, эканамістаў, таваразнаўцаў, тэхнолагаў.

Сітуацыя на месцах ускладнялася значнай тякучасцю сярэдняга звяна. За 1946 г. у Баранавіцкім аблспажыўсаюзе з 15 старшынь райспажыўсаюзаў змянілася 18, у Пінскім – 10 з 11 [12, л. 22]. Становішча тлумачылася тым, што на месцы не хапала вопытных работнікаў, 62 % старшынь райспажыўсаюзаў выконвалі свае абавязкі менш года. Карыстаючыся няхваткай падрыхтаваных кадраў, у спажыўкааперацыю рэспублікі рушыліся гандлёвыя работнікі з іншых рэгіёнаў краіны, якія дыскрэдытавалі сябе на ранейшым месцы, так за 1947 г. у Маладзечанскай вобласці было 223 выпадкі растрат; растратчыкаў з мясцовага насельніцтва было 65 чалавек, а прыбыўшых з іншых абласцей – 158 [3, л. 224].

Асноўная нагрузка ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў ляжала на сярэдніх навучальных установах Белспажыўсаюза. Да вайны мелася 2

гандлёва-кааператыўных тэхнікумы – Віцебскі і Гродзенскі. Віцебскі тэхнікум так і не быў адноўлены, а Гродзенскі аднавіў сваю дзейнасць з 1944 г. У 1946 г. кааптэхнікум скончыла першая група бухгалтараў у колькасці 25 чалавек. Усяго за гады свайго існаваня (1944 – 1953 гг.) тэхнікум падрыхтаваў 568 чалавек.

Бухгалтараў, планавікоў, нарыхтоўшчыкаў і таваразнаўцаў меней высокай кваліфікацыі рыхтавалі аднагадовыя гандлёва-кааператыўныя школы, якія існавалі ў Брэсце (з 1945 па 1954 гг.), Гродне (з 1945 па 1948 гг. і з 1952 г.), г.п. Моўчадзі (з 1945 па 1952 гг.). Як правіла, у рэспубліцы адначасова працавалі 3 – 4 такія школы. Перамены месц іх размяшчэння былі выкліканы некалькімі прычынамі. У першыя пасляваенныя гады гандлёва-кааператыўныя школы размяшчаліся ў заходніх абласцях рэспублікі (3 з 4), што было выклікана найбольш вострай няхваткай кадраў.

У першыя пасляваенныя гады з дапамогай спажыўкааперацыі ў заходніх абласцях Беларусі пачалі ўтварацца розныя сельскагаспадарчыя кааператыўныя аб'яднанні.

Некаторы вопыт у гэтай дзейнасці быў накоплены ў Маладзечанскай вобласці, дзе пераход да вытворчага каапеpавання адбываўся з дапамогай спажывецкай кааперацыі. Тут на аснове сельпо ствараліся машынныя таварыствы. Спажывецкая кааперацыя вобласці ў 1947 г. мела нядрэнны прыбытак за кошт нарыхтовак прадуктаў па рыначных цэнах і продажу іх у гарадах. Тая частка прыбытку, якая па Статуту ішла пайшчыкам, па рашэнню агульных сходаў накіроўвалася на стварэнне машынных таварыстваў. Вядома, яна была недастатковай для закупкі трактароў, але жняяркі, касілкі, арфы гэтыя таварыствы набывалі. Найбольшае распаўсюджанне падобная практыка атрымала ў Юрацішкаўскім раёне. У Маладзечанскай вобласці спажывецкія таварыствы таксама прымалі ўдзел у стварэнні грамадскага семяннога фонду, таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі [13, л. 261]

*Крыніцы*


1. Нацыянальны архіў РБ. Ф. 7. Воп. 3. Спр. 2.
2. НАРБ. Ф. 332. Воп. 5. Спр. 161.
3. НАРБ. Ф. 332. Воп. 5. Спр. 168.
4. НАРБ. Ф. 332. Воп. 5. Спр. 167.
5. НАРБ. Ф. 4. Воп. 81. Спр. 158.
6. НАРБ. Ф. 4. Воп. 44. Спр. 36.
7. НАРБ. Ф. 332. Воп. 6. Спр. 9.
8. НАРБ. Ф. 332. Воп. 5. Спр. 245 а.
9. НАРБ. Ф. 332. Воп. 5. Спр. 255 а.
10. НАРБ. Ф. 332. Воп. 5. Спр. 36.
11. НАРБ. Ф. 332. Воп. 5. Спр. 158.
12. НАРБ. Ф. 332. Воп. 5. Спр. 25.
13. НАРБ. Ф. 4. Воп. 95. Спр. 2.